Марыя
ЛЯШУК,
г. Пінск



***

*Жыта-жыцейка –*
*у рост,*
*Каласы сонца*
*спеліць.*
*Не глядзі на ўзрост,*
*Калі ў сэрцы мяцеліць.*

*І валошкі той сінь*
*Зноў хвалюе, трывожыць.*
*Ты мяне не пакінь,*
*Мой жаданы, прыгожы.*

*Лашчыць ветрык зямлю,*
*Хлебам пахне так смачна.*
*Нібы подых – «Люблю!»*
*Сэрца прыме ўдзячна.*

*Неба песняй трымціць*
*Жаўрукова-шчымлівай.*
*Поруч мы ў жыцці –*
*Як не быць мне шчаслівай!*

*Лета жыцейка жне,*
*А жыццё спеліць лёсы.*
*Хай нядоля міне –*
*Нас бароняць Нябёсы.*

## Палессе

*Тут танканогія аўсы*
*У пояс кланяюцца ветру,*
*І залатыя каласы*
*Смакуюць чыстае паветра.*

*Ваду жывучую з крыніц*
*П'юць нават зоркі вечарамі...*
*Для сінявокіх чараўніц –*
*Чароды хлопцаў кучаравых...*

*Мне перашкоды па плячы*
*Яшчэ з бацькоўскага парога,*
*Але за шчасце палічы –*
*Прайсці чаромхавай дарогай.*

*Да лесу сцежачка вядзе*
*Праз луг, дзе я хадзіла босай.*
*І па калені ў вадзе*
*Брыдуць насустрач мне бярозы.*

***

*Жаўтавокія рамонкі падары,*
*Танканогія азёрныя лілеі,*
*Медуніцы з цьмяным*
*водбліскам зары.*
*І званочкі, што нябёсамі сінеюць.*

*Адхілі хмурынкі тоненькую цень.*
*Зноў маўчаць у гэты вечар нам*
*не трэба.*
*І на пальчык мой сягоння ты*
*надзень*
*Залаты пярсцёнак месяца на небе.*